# Урок 26

У годзе 12 месяцаў. Колькі месяцаў у кожнай пары года?




Вылічы па календары, колькі ўсяго сутак у годзе. Можа атрымацца 365 або 366 сутак.

Год, у якім 366 сутак, называюць **высакосным.**
У высакосным годзе ў лютым 29 сутак.
Высакосны год выпадае 1 раз на 4 гады.

**1.** Дапоўні сказы.
- У годзе 7 месяцаў, у кожным з якіх ... суткі. Гэтыя месяцы — … .
- У годзе 4 месяцы, у якіх па ... сутак. Гэтыя месяцы — … .
- У годзе ёсць месяц, у якім 28 або 29 сутак. Гэты месяц — … .

**2.** Вызнач па календары, які зараз год — высакосны або невысакосны. Які быў мінулы год? Які будзе наступны год?

**3.** Вызнач па календары, якім быў год твайго нараджэння — высакосным або невысакосным. Колькі было ў ім сутак?



Правообладатель Национальный институт образования



**4.** Прачытай запісы па ўзоры.

| | |
|---|---|
| 1 г. = 12 мес. | Адзін год роўны дванаццаці месяцам. |
| 5 г. = 60 мес. | Пяць гадоў роўныя шасцідзесяці месяцам. |

3 г. = 36 мес.          7 г. = 84 мес.          24 мес. = 2 г.

**5.** Прачытай выразы. Знайдзі іх значэнні.
1200 + (1200 + 500)          1200 – (1200 – 500)

**6.** Выканай дзяленне з астачай.
91 : 5          17 : 25          526 : 4          289 : 7

**7.** Паміж двума гарадамі 960 км. Трэцюю частку гэтай адлегласці цягнік прайшоў са скорасцю 80 км/г. Ці зможа цягнік прайсці адлегласць, якая засталася, за 4 г, калі будзе рухацца са скорасцю 110 км/г?

**8.** Выберы схему. Рашы задачу.
У дзвюх скрынях 69 кг дэталей. Маса дэталей у адной скрыні складае палову масы дэталей у другой скрыні. Знайдзі масу дэталей у кожнай скрыні.







**?** Які зараз месяц? Колькі сутак у гэтым месяцы?

**1.** Вылічы.
738 : 6 – 861 : 7          5 · 195 – 875 : 5

**2.** На 3600 р. для спартыўнай школы можна купіць 200 аднолькавых футболак. Колькі такіх футболак можна купіць на 5400 р.?



Правообладатель Национальный институт образования



# Урок 27

Для вымярэння вялікіх часавых прамежкаў выкарыстоўваюць буйную адзінку часу — **стагоддзе**.

**Стагоддзе** — адзінка часу.
Адно стагоддзе роўнае ста гадам.
**1 ст. = 100 г.**

Разгледзь схему, на якой паказаны 5 стагоддзяў у выглядзе адрэзкаў.




Стагоддзі прынята лічыць ад пункта, які называюць пачаткам летазлічэння. Гэты пункт на схеме абазначаны лічбай 0.

Паміж якімі пунктамі на схеме размешчаны пункт, які абазначае 150-ы год? Якое гэта па ліку стагоддзе?

Дапоўні разважанне.



1. Першае стагоддзе доўжылася ... гадоў і закончылася сотым годам.
2. Другое стагоддзе доўжылася яшчэ ... гадоў і закончылася ... годам.
3. Паміж сотым годам і двухсотым годам знаходзіцца стопяцідзясяты год.
4. Значыць, стопяцідзясяты год быў у ... стагоддзі.

**1.** Колькі гадоў складаюць 3 стагоддзі; 5 стагоддзяў; 7 стагоддзяў; 2 стагоддзі і 40 гадоў; 10 стагоддзяў і 10 гадоў?

**2.** Да якога па ліку стагоддзя адносяцца гэтыя гады?

| | | |
|---|---|---|
| 289 г. | 401 г. | 552 г. |
| 925 г. | 1399 г. | 2014 г. |



Правообладатель Национальный институт образования

## Урок 27



**3.** Вылічы.

6 г. 9 мес. + 1 г. 2 мес.
1 г. 1 мес. + 2 г. 7 мес.
7 г. 10 мес. – 2 г. 9 мес.
3 г. 11 мес. – 1 г. 6 мес.

2 г. 4 мес. : 7
1 г. 2 мес. · 4
1 сут. 6 г · 3
3 сут. 2 г : 2

**4.** Рашы ўраўненні.

$4 \cdot x = 708$ $\quad$ $894 : y = 6$ $\quad$ $20\,000 - a = 18\,000$

$m \cdot 3 = 369$ $\quad$ $n : 3 = 276$ $\quad$ $k - 640\,000 = 360\,000$

**5.** Начарці прамавугольнік з даўжынямі старон 6 см 5 мм і 3 см 5 мм. Знайдзі перыметр гэтага прамавугольніка.

**6.** Ліфт у жылым доме можа падымаць груз масай не большай за 400 кг. На ліфце трэба падняць на пяты паверх груз масай 220 кг. Колькі грузчыкаў змогуць паехаць у ліфце разам з грузам, калі маса кожнага грузчыка — 90 кг?

Ці зможа такі ліфт падняць усіх членаў тваёй сям'і?



**?** Колькі гадоў складаюць 1 стагоддзе; 5 стагоддзяў; 10 стагоддзяў?

**1.** Рашы ўраўненні.

$7 \cdot x = 924$ $\quad$ $882 : y = 6$

$m \cdot 8 = 752$ $\quad$ $448 : n = 7$

**2.** Веласіпедыст некалькі гадзін ехаў са скорасцю 12 км/г, а астатні шлях ён праехаў за 4 г са скорасцю 15 км/г. Увесь шлях склаў 96 км. Колькі часу веласіпедыст ехаў першую частку шляху?



Правообладатель Национальный институт образования